Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 МАЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 94 (25959)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Майская гарачыня б'е тэмпературныя рэкорды

На выхадныя зноў чакаецца да 33 градусаў

У апошнія дні сярэднясутачная тэмпература была на 7—11 градусаў вышэй кліматычнай нормы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. 23 мая ў Гомельскім і Лельчыцкім раёнах былі перавышаны абсалютныя тэмпературныя максімумы мая, калі тэмпература паветра дасягала адпаведна 32 і 33 градусаў. Такая гарачыня назіралася ў маі ўпершыню за ўвесь час інструментальных назіранняў, якія складаюць больш за 100 гадоў.

Аднак ужо сёння на тэрыторыю Беларусі завітала больш свежае паветра з боку Скандынаўскага паўвострава. Тэмпературны максімум паветра ў чацвер будзе вагацца ад 19 градусаў на поўначы краіны да 28 градусаў на поўдні рэспублікі. У сталіцы 24 мая будзе 21—23 градусы.

У наступныя дні да нас зноў прыйдзе даволі цёплы антыцыклон з боку Заходняй Еўропы. У пятніцу—суботу ападкаў амаль не прадбачыцца, толькі ў суботу ўдзень месцамі па Гродзенскай і Віцебскай абласцях магчымы кароткачасовыя навальнічныя дажджы.

Тэмпература паветра ў ноч на 25 мая — 8—14 градусаў, удзень — 23—29, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 31 градуса. У суботу спякота яшчэ прыплюсуе некалькі градусаў, калі тэмпература паветра ўдзень будзе дасягаць ужо 27—33 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗАДАЧА ДЗЯРЖАВЫ НЕ Ў ПАДТРЫМЦЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ЛЬГОТАМІ, А Ў СТВАРЭННІ ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ ЯГО ДАБРАБЫТУ

Галоўная задача дзяржавы не ў падтрымцы насельніцтва нейкімі льготамі, а ў стварэнні такога ўзроўню дабрабыту і такіх дахадаў, каб чалавек самастойна змог выбраць і атрымаць тое, што яму патрэбна. Аб гэтым у інтэрв'ю журналістам у Мінску заявіла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч. Менавіта на гэта, паводле яе слоў, нацэлена ў тым ліку і праводзімая палітыка па ўпарадкаванню сацыяльных ільгот.

Наталля Пяткевіч падкрэсліла, што дзяржава не адмаўляецца ад сацыяльнай дапамогі і падтрымкі насельніцтва. Размова ідзе аб тым, што іх павінны атрымліваць тыя, хто сапраўды мае патрэбу. «Заўсёды будуць катэгорыі асобаў, якім дзяржава павінна працягнуць руку дапамогі, і яна ім яе працягне», — упэўнена яна.

Цяпер Беларусь ідзе па шляху адмены «агульных» ільгот, замяняючы іх адраснай сацыяльнай дапамогай. Пры гэтым яна дадала, што прадастаўляючы тую або іншую льготу, дзяржава «забірае сродкі ў некага». Так, з бюджэту штогод на сацыяльную сферу выдзяляецца пэўная сума, якая і пераразмяркоўваецца ўнутры гэтай сферы. «Напрыклад, калі мы даём бясплатныя лякарствы ўсім, незалежна ад таго, патрэбен або не патрэбен чалавеку той або іншы прэпарат, значыць, у выпадку няхваткі грошай, у бальніцы, дзе знаходзяцца дзеці, можа не быць дастатковай колькасці лекавых сродкаў», — растлумачыла Наталля Пяткевіч.

Яна таксама падкрэсліла, што льготы не павінны ператварацца ва ўтрыманства.

Працэс упарадкавання льгот у Беларусі пачаўся задоўга да прыняцця адпаведнага законапраекта. Наталля Пяткевіч адзначыла, што яшчэ ў 2006 годзе згодна з указамі былі вырашаны пытанні, якія датычацца санаторна-курортнага аздараўлення, службовага і сацыяльнага жылля. «Гэта планамерны працэс і ён будзе прадаўжацца».

Як сказала Наталля Пяткевіч, упарадкаванне льгот пачалося не з насельніцтва рэспублікі. Так, агульнае льготаванне і дзяржаўная падтрымка прадпрыемстваў была ліквідавана ўжо некалькі гадоў таму. Беларусь перайшла на адрасную, індывідуальную дзяржпадтрымку асобна ўзятых прадпрыемстваў. Адраснасць і катэгарыяльнасць павінны быць пакладзены ў аснову аказання ўсёй сацыяльнай дапамогі. На яе думку, упарадкаванне льгот з'яўляецца неабходным крокам. Пры гэтым гаварыць аб тым, што выключэнне нейкіх людзей з ільготных катэгорый з'яўляецца непавагай да іх з боку дзяржавы, няправільна. «Удзячнасць людзям, якія маюць нейкія заслугі перад краінай, іх маці і сем'ям не вымяраецца льготамі. Гэта розныя рэчы», — лічыць Наталля Пяткевіч.

Закон аб упарадкаванні льгот і ўказ аб адраснай сацыяльнай дапамозе ўступяць у сілу адначасова, аб гэтым заявіла Наталля Пяткевіч.

Яна растлумачыла, што закон уступіць у сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання. Праект указа павінен быць распрацаваны ў трохмесячны тэрмін. «Іншымі словамі, закон, які адмяняе льготы, і абноўлены механізм аказання адраснай сацыяльнай дапамогі ўступяць у сілу адначасова. І ўсе негатыўныя наступствы закона абавязкова будуць знівеліраваны».

Наталля Пяткевіч адзначыла, што цяпер аказанне адраснай сацыяльнай дапамогі рэгламентуецца пастановай урада. У праекце ўказа, які распрацоўваецца, будуць прапісаны канкрэтныя катэгорыі грамадзян, якія маюць права на такую дапамогу, падставы і парадак яе атрымання. Асаблівая ўвага ў дакументе будзе звяртацца на тое, каб механізм прадастаўлення адраснай сацыяльнай дапамогі быў адкрытым, празрыстым і дэбюракратызаваным. Гэта будзе перашкаджаць злоўжыванням з двух бакоў: у чыноўнікаў не будзе суб'ектывізму, а атрымліваць дапамогу будуць тыя, хто сапраўды мае патрэбу.

У сувязі з гэтым Наталля Пяткевіч падкрэсліла, што сацыяльная справядлівасць якраз і заключаецца ў тым, што дзяржава клапоціцца і пра ветэрана вайны, які атрымлівае невысокую пенсію, і пра выхавацельку дзіцячага сада, чый узровень даходаў таксама невялікі. «Сацыяльная справядлівасць — гэта роўная абарона тых, хто знаходзіцца ў цяжкім становішчы, а не дапамога таму, што чалавек адносіцца да той або іншай катэгорыі льготнікаў», — рэзюмавала яна.

У Беларусі чыноўнікі не маюць ніякіх асаблівых ільгот. Гэта адзначыла Наталля Пяткевіч. Паводле яе слоў, у час падрыхтоўкі законапраекта аб упарадкаванні льгот да разгляду ў Авальнай зале некаторыя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый выказвалі меркаванне, што ўпарадкоўваць ільготы чыноўнікі павінны перш за ўсё з сябе. «З увядзеннем інстытута прэзідэнцтва яшчэ ў 1994 годзе ўсё было адменена. Сёння ў чыноўнікаў няма ніякіх ільгот, спецабслугоўвання», — сказала Наталля Пяткевіч.

У прыватнасці яна адзначыла, што чыноўнікі будуюць сабе жыллё на агульных падставах і не маюць права на льготныя крэдыты, калі не адносяцца да нейкай катэгорыі насельніцтва, якая мае на гэта права. «Спекуляцыя на гэтай тэме зусім не да месца», — падкрэсліла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

БЕЛТА.

Асцярожна: спякота!

ЯК ЗНАЙСЦІ ПАРАТУНАК АД ПЕКЛА?

Фота Пятра ФАМІНА.

Зіма сёлетняя біла рэкорды. Памятаеце: было незвычайна цёпла. Сіноптыкі нават губляліся ў здагадках: упершыню ці то за 100 апошніх гадоў маем такія рэкорды, ці то за 150... І вось вясна, дакладней — май, пераняў дастойную ў гэтым плане эстафету. 22-га слупок тэрмометра ў сталіцы ўзняўся да адзнакі плюс 30,3 градуса. Папярэдні рэкорд гэтага дня раўняўся 29 градусам і быў устаноўлены ажно ў 1932 годзе — 75 гадоў таму. У той жа дзень абнавіліся тэмпературныя рэкорды ў ва ўсіх абласных цэнтрах.

Але і гэта яшчэ не ўсё. Пасля зусім непрыкметнага пахаладання — літаральна на дзень — у гэтыя выхадныя стартуе чарговы віток майскай спякоты: з Заходняй Еўропы да нас рухаецца новы антыцыклон, які прынясе на Беларусь спякотнае, сухое, трапічнае паветра. Тэмпература ўзнімецца ў асобных раёнах да +34. І, як мяркуюць спецыялісты беларускага гідрамета, такая цяплынь у нас затрымаецца надоўга.

Добра гэта, ці не? У кожнага знойдзецца свой адказ на гэтае пытанне. Асабліва складана прыходзіцца жыхарам буйных гарадоў. Для іх такая тэмпература азначае не проста спякоту, а сапраўднае пекла: складана адаптавацца да таго, што табе няма чым дыхаць. Пульс перавальвае за 100 удараў у хвіліну. Наогул, жыхарам мегаполісаў, як лічаць медыкі, варта быць гатовымі да праблем са здароўем нават пры 30-градуснай спякоце. Так званая тэмпература камфорту (гэта значыць, наколькі вы сябе адчуваеце) пры гэтым можа павысіцца да 40 градусаў. Так было ў 2003 годзе. Сцены дамоў, асфальт накаляюцца, машыны ў пробках газуюць — як тут тэмпература знізіцца? Вечары і ночы таксама не выратоўваць — паветра не паспявае астынуць.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

СТРАХОЎКА АЎТАМАБІЛЯ — СА СКІДКАЙ

Прыемны сюрпрыз чакае шматлікую армію аўтааматараў: як мяркуецца, ужо ў гэтым годзе дысцыплінаваныя вадзіцелі, якія пры страхаванні аўтамабіля атрымліваюць скідку за безаварыйную язду на працягу года, будуць узнагароджвацца дадаткова — пэўнай скідкай за аплату страхоўкі безнаяўнымі грашыма — (пластыкавай карткай). Праўда, такую магчымасць атрымаюць толькі аўтааматары, якія з'яўляюцца кліентамі «Беларусбанка» і расплачваюцца карткай гэтай фінансавай установы пры заключэнні страхавога дагавора ў «Белдзяржстраху». Прынамсі, перагаворы на гэты конт зараз вядуцца паміж памянёным банкам і «Белдзяржстрахам», пра гэта паведаміў карэспандэнту «Звязды» на ўчарашняй сустрэчы з журналістамі дырэктар разліковага цэнтра пластыкавых картак ААБ «Беларусбанк» Анатоль Багавік.

Між іншым, размова ідзе не толькі пра страхаванне аўтамабіляў. Іншыя віды страхавання ў кампаніі «Белдзяржстрах» з дапамогай карткі «Беларусбанка» таксама будуць заахвочвацца зніжэннем страхавой сумы. Аднак, вяртаюся да аўтааматараў. Яшчэ адна прыемная навіна для іх, і зноў-такі прагучала яна з вуснаў Анатоля Багавіка: банк вядзе таксама перагаворы аб пэўных скідках для ўладальнікаў картак пры запраўцы аўтамабіляў палівам на некаторых АЗС.

А наогул, учарашняя прэс-канферэнцыя была склікана з іншай нагоды: буйнейшы банк краіны пераступіў мільённы рубеж эмісіі картак міжнароднай плацежнай сістэмы Visa International. Агульная ж колькасць выпушчаных банкам пластыкавых картак дасягнула 2,2 мільёна штук: такім чынам, зараз на долю «Беларусбанка» прыходзіцца больш за палову — 54 працэнты ад агульнай колькасці картак, якія выпушчаны банкамі на тэрыторыі нашай краіны. Як паведаміў Анатоль Багавік, банкам ужо ўстаноўлена 706 банкаматаў, у 154 з якіх можна атрымаць як беларускія рублі, так і долары ЗША. Шырокі спектр безнаяўных аперацый дазваляюць праводзіць 628 інфакіёскаў банка. Акрамя таго, у 1381 аддзяленні банка трымальнікі картак могуць зняць наяўныя грошы, а ў 894 аддзяленнях — аплаціць у безнаяўным парадку камунальныя і іншыя плацяжы. Плацежныя тэрміналы ўстаноўлены банкам у 2074 прадпрыемствах гандлю і сэрвісу.

Паводле даных банка, найбольш запатрабаваная паслуга ў насельніцтва рэспублікі — аплата з дапамогай карткі паслуг аператараў мабільнай сувязі. У прыватнасці, за красавік аб'ём такіх плацяжоў перавысіў суму ў 20 мільярдаў рублёў. Што ж датычыцца супрацоўніцтва банка з буйнейшай плацежнай сістэмай Visa International, то яно пачалося параўнальна нядаўна — у 2000 годзе. Тым не менш, зазначыў Анатоль Багавік, яно развіваецца імкліва і дазваляе «Беларусбанку» выкарыстоўваць самыя апошнія распрацоўкі ў галіне карткавага бізнэсу. У сваю чаргу Святлана Геарбелідзе, якая з'яўляецца рэгіянальным менеджарам сістэмы па краінах СНД, выказала ўдзячнасць «Беларусбанку» за актыўны ўдзел у развіцці рынку безнаяўных плацяжоў у Беларусі і далучэнне насельніцтва краіны да сучаснага фінансавага інструменту для аплаты тавараў і паслуг.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ:

- гальванического цеха (общ. пл. 712 кв.м): Борисовский р-н, д. Лошница;
- складских помещений (319, 7 кв.м): г. Борисов, ул. Демина, 5;
- гаражного комплекса (гаражи №№25, 26, 29, № 30А, 35, 36, 37 по 21, 6 кв.м): г. Борисов, ул. Чапаева, 84;
- проходной (14,2 кв.м), административного здания (104 кв.м), мастерской (457, 5 кв.м): г. Борисов, ул. Почтовая, 61;
- ангара металлического общ. пл. 372, 5 кв.м и гаражного комплекса (боксы 1-6) общ. пл. 405, 4 кв.м: г. Борисов, ул. Ибаррури, 9;
- 1/2 части автостоянки, в том числе: часть здания автомобильной стоянки (общ. пл. 11, 5 кв.м) и стоянки (асфальтное покрытие, ограждение) общ. пл. 2889 кв.м по ул. Даумана, 78 в г. Борисове;
- торгового киоска (общ.пл. 17, 2 кв.м): г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ;
- здание склада овощехранилища (общ. пл. 1412 кв.м): г. Несвиж, ул. Ленинская, 124. Пл. зем. участка 0, 4526 га;
- незавершенной строительством летней базы отдыха «Левки» на берегу озера «Левки» Стародорожского района на зем. участке общ. пл. 1,1005 га.

Контактные телефоны: (8017) 2246134.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЯРХОЎНЫ СУД АББІНАВАЦІЎ ЮШЧАНКУ ВА ЎЗУРПАЦЫІ СУДОВАЙ УЛАДЫ

Вярхоўны суд і Савет суддзяў Украіны абвінавацілі прэзідэнта краіны Віктара Юшчанку ў выданні ўказаў, якія датычацца судоў, без юрыдычных падстаў.

У прыватнасці, у адпаведнай заяве ўзгадваюцца ўказы прэзідэнта, у якіх рэгламентуюцца паўнамоцтвы кіраўніка Вярхоўнага суда, кіраўнікоў вышэйшых спецыялізаваных судоў, Савета суддзяў і іншых органаў судовага самакіравання, і ўводзіцца не прадугледжаная законам працэдура прызначэння суддзяў на адміністрацыйныя пасады ў судах агульнай юрысдыкцыі. Усё гэта, адзначаецца ў заяве, выклікае «вялікую занепакоенасць», паколькі кіраўнік дзяржавы «самаасобна», без удзелу органаў судовага самакіравання, надзяляе сябе правам прызначаць выконваючых абавязкі кіраўнікоў судоў.

Нагадаем, што крыху раней у сераду Канстытуцыйны суд прызнаў неканстытуцыйным прызначэнне і звальненне кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў судоў прэзідэнтам краіны. Таксама напярэдадні Галасееўскі раённы суд Кіева вынес рашэнне адмовіць Віктару Юшчанку ў разглядзе яго іску ў адносінах да трох суддзяў КС, а Генеральная пракуратура закрыла справу. Сутнасць іску прэзідэнта ў тым, што нягледзячы на яго ўказ аб звальненні, суддзі КС працягвалі выконваць свае абавязкі.

БУШ АДОБРЫЎ ПЛАН ЦРУ ПА ДЭСТАБІЛІЗАЦЫІ ІРАНА

ЦРУ атрымала сакрэтнае адабрэнне прэзідэнта ЗША Джорджа Буша на правядзенне тайнай аперацыі па дэстабілізацыі ўрада Ірана, паведаміла ABC News са спасылкай на крыніцы ў амерыканскіх спецслужбах.

План ЦРУ, як мяркуецца, уключае прапагандысцкую кампанію па дэзінфармацыі насельніцтва, а таксама маніпуляцыі з іранскай валютай і міжнароднымі фінансавымі трансакцыямі. Мэтай аперацыі з'яўляецца аказанне ціску на Іран для спынення яго ядзернай праграмы і спынення падтрымкі іракскіх баевікоў.

Паводле крыніцы агенцтва, згода Буша азначае, што прэзідэнт вырашыў пакуль не распачынаць ваенных дзеянняў супраць Ірана, хоць такі варыянт прапаноўваўся яго атачэннем і ў прыватнасці віцэ-прэзідэнтам Дзікам Чэйні. Падпісаны прэзідэнтам дакумент не будзе абнародаваны, аднак з ім азнаёмяцца члены камітэтаў па разведцы ў Сенаце і Палаце прадстаўнікоў, а таксама іншыя ключавыя фігуры ў Кангрэсе ЗША.

ВЫБУХ У АНКАРЫ: ЗНОЎ КУРДСКІЯ СЕПАРАТЫСТЫ

Турэцкія следчыя прыйшлі да высновы, што выканаўцам выбуху, які адбыўся ў Анкары вечарам 22 мая, быў чалавек, якога падазраюць у сувязях з курдскімі сепаратыстамі, паведамляе France Presse.

Паліцэйскія знайшлі часткі цела тэрарыста-самазабойцы — 28-гадовага мужчыны з крымінальным мінулым. Яго імя не значылася ў спісах ахвяраў тэракта.

Нагадаем, што выбух у гандлёвым цэнтры аднаго з раёнаў старой Анкары стаў прычынай гібелі шасці чалавек. Яшчэ больш за сто чалавек былі накіраваны ў бальніцы з раненнямі рознай ступені цяжкасці.

ЛАТВІЙСКІХ ЛІХАЧОЎ ЗАКЛІКАЛІ ЗАПІСВАЦЦА Ў ДОНАРЫ ОРГАНАЎ

Па ініцыятыве Дэпартамента бяспекі дарожнага руху Латвіі ў краіне стартавала сацыяльная акцыя пад лозунгам «Ліхач, завяшчай свае органы для трансплантацыі». Паводле слоў арганізатараў, мэта кампаніі — прымусіць несвядомых кіроўцаў па-новаму паглядзець на праблему бяспекі на дарогах.

Гэта ўжо трэцяя гучная рэкламная акцыя латвійскага ДБДР супраць п'янства і ліхачства на дарогах. Раней, нагадваючы пра тое, што язда ў стане алкагольнага ап'янення караецца турэмным зняволеннем, Дэпартамент бяспекі руху запусціў па тэлебачанні серыю перадач пра турэмныя норавы. Яшчэ раней выйшла серыя перадач «Пі, едзь і далучайся» — пра жыццё людзей, якія сталі інвалідамі з-за язды ў нецвярозым стане.

Парламенцкі дзённік

«ПРАБЛЕМА АПТЫМІЗАЦЫІ ЛЬГОТ ВЫСПЕЛА»

Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі амаль аднагалосна прынялі адразу ў двух чытаннях законапраект «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян». Плануецца, што дакумент пачне дзейнічаць з пачатку наступнага года.

Паводле слоў **міністра працы і сацыяльнай абароны Уладзіміра ПАТУПЧЫКА,** які прадстаўляў дэпутатам законапраект, шырокае распаўсюджанне сацыяльных ільгот і гарантый, атрымальнікамі якіх у нашай краіне з'яўляюцца прыкладна дзве трэці насельніцтва, вядзе да неэфектыўнага выкарыстання бюджэтных сродкаў, да перакосаў у размеркаванні самі ільгот. Прадастаўленне льгот, лічыць ён, «напэўна, найбольш затратная і найменш эфектыўная форма дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва». Так, у 2006 годзе на фінансаванне льгот было выдзелена больш за 600 млрд рублёў бюджэтных сродкаў, што больш, чым на «самыя буйныя прыярытэтныя сацыяльныя праграмы». Пры гэтым міністр працы і сацыяльнай абароны лічыць, што льготы не аказваюць адчувальнага ўплыву на сацыяльна-эканамічнае становішча малазабяспечаных людзей і скарачэнне ўзроўню беднасці, бо размяркоўваюцца па фармальных падставах. У выніку на адну сям'ю розных ільгот і датацый прыходзіцца нават менш чым 20 тысяч рублёў у месяц, што не можа істотна ўплываць на бюджэт грамадзян. На льготы прыпадае ўсяго 2,3 працэнта агульных даходаў сям'і, а самі яны часта трапляюць больш забяспечанай частцы атрымальнікаў. Паводле даных статыстыкі, абследаванне хатніх гаспадарак за 2001—2006 гады паказала, што на першыя 20 працэнтаў атрымальнікаў ільгот, якія адносяцца да найменш забяспечаных, прыходзілася 17,2 працэнта ад агульнай сумы льгот, на другія 20 працэнтаў — 19,7, трэція — 20,3, чацвёртыя — 20,8, пятыя, самыя забяспечаныя — 22. У неспрыяльным становішчы таксама знаходзяцца вясковыя жыхары, якія не рэалізоўваюць сваё права на льготы, бо не маюць цэнтралізаванага ацяплення, водазабеспячэння, радзей карыстаюцца паслугамі транспарту.

Уладзімір Патупчык таксама падкрэсліў, што ўводзіліся льготы ў іншых сацыяльных, эканамічных і палітычных умовах. Сёння ж многае змянілася, і на першы план вылучыліся пытанні забеспячэння эфектыўнай эканомікі, яе канкурэнтаздольнасці. Нельга, лічыць міністр, не ўлічваць і дынаміку даходаў насельніцтва.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

Знаёмцеся: пі-трубы

Адна з самых актуальных праблем жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міншчыны — страта энергіі ў час яе транспарціроўкі па цеплатрасах — зараз будзе вырашацца больш хуткімі тэмпамі. У пасёлку Гатава пачало працаваць прадпрыемства «Ізалітцепласетка», якое будзе выпускаць папярэдне ізаляваныя трубы. Тэхналогія, па якой вырабляецца пі-труба, дазваляе эканоміць энергіі ў пяць-шэсць разоў больш.

Паводле слоў намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама Анатоля Мірчука, прадпрыемства ў стане забяспечыць патрэбы ўсяго цэнтральнага рэгіёна.

— Прыемна, што ў Мінскай вобласці запускаецца такая буйная вытворчасць. І заўважце, напярэдадні самай гарачай для рамонту камунальных сістэм пары. Страты цяпла ў папярэдне ізаляваных трубах складаюць адзін градус на адзін кіламетр, а ў звычайных цеплаправодах — пяць—сем градусаў, — каментуе міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў. — Мы пакуль адстаём ад еўрапейскай сістэмы прадухілення страт цяпла, і таму, каб дагнаць суседзяў і захаваць энергетычную бяспеку краіны, перад галіной стаіць задача скараціць спажыванне энергіі ў тры разы. Мінская вобласць, як мы бачым, пайшла наперад — дзякуючы новым пі-трубам цяпла яна будзе эканоміць у пяць разоў больш. Увогуле, наша жыллёва-камунальная гаспадарка ўтрымлівае 40 мільёнаў метраў сетак, уявіце сабе, імі можна аперазаць экватар. З іх 45 працэнтаў складаюць менавіта цеплавыя сеткі. Таму зразумела, наколькі актуальная праблема захавання цяпла ў час транспарціроўкі энергіі па трубах, ад кацельні да спажыўца.

Тэхналогія вытворчасці і пракладкі папярэдне ізаляваных труб з'явілася ў Расіі больш за пяць гадоў таму, і адразу ж завявала сваіх прыхільнікаў. Матэрыялы, якія высцілаюць унутраныя сценкі трубы, прадухіляюць выхад цяпла на паверхню, і, акрамя таго, у выпадку прарыву сістэмы можна будзе з дакладнасцю да аднаго метра вызначыць участак, на якім здарылася аварыя. На прадпрыемстве «Ізалітцепласетка» будуць працаваць 27 чалавек, іх заработная плата складзе каля мільёна рублёў у месяц. Агульны кошт узвядзення завода склаў 2,8 мільярда рублёў, з іх 1,1 мільярда накіравана з бюджэтных сродкаў аблвыканкама. Паводле падлікаў спецыялістаў, усе выдаткаваныя на будаўніцтва прадпрыемства сродкі акупяцца праз паўтара года. Рэнтабельнасць вытворчасці чакаецца ў межах 10—11 працэнтаў. Пакуль завод працуе толькі на патрэбы Мінскай вобласці, аднак, як расказаў яго дырэктар Вадзім Ганчар, праз тры-чатыры гады, калі замена цеплатрас у цэнтральным рэгіёне завершыцца, папярэдне ізаляваныя гатаўскія трубы будуць экспартавацца ў іншыя рэгіёны краіны і замежжа. Попыт на такую прадукцыю будзе ўстойлівым яшчэ доўга.

— Калі ўлічваць, што глыбіня закладкі траншэі для пі-труб пры стварэнні цепласетак скарачаецца амаль напалову, і хуткасць, з якой будуць перакладвацца магістральныя трубаправоды, значна ўзрастае, то ўсе рамонтна-аднаўленчыя работы можна будзе праводзіць у больш сцісліыя тэрміны, — падкрэсліў старшыня Мінскага аблвыканкама Мікалай Дамашкевіч. — Я не буду стамляць лічбамі, якія сведчаць аб выгаднасці нашага новага праекта. Скажу толькі, што пачатак работы прадпрыемства па вырабу папярэдне ізаляваных труб з'яўляецца яшчэ адным крокам да рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, пры якой усе органы і службы павінны павярнуцца тварам да чалавека, задавальняць патрэбы людзей.

Згодна з планамі, прадпрыемства будзе вырабляць больш за 60 кіламетраў труб у год. Разам з трубамі «прамога» профілю завод у Гатаве, дарэчы, адзін з нямногіх, выпускае і фасонныя трубы.

Як адзначыў Анатоль Мірчук, у сувязі з актыўным будаўніцтвам жылля на Міншчыне, для забеспячэння кватэр энергіяй трэба праводзіць новыя цеплавыя сеткі. Таму паралельна з работай завода ў Гатаве разглядаецца пытанне аб стварэнні на тэрыторыі барысаўскага завода пластмасавых вырабаў аналагічнай вытворчасці пі-труб, якія будуць забяспечваць патрэбы будаўнічага комплексу.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.05.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 878,91
1 латвійскі лат	4 135,34
1 літоўскі літ	833,27
1 чэшская крона	101,89
1 польскі злоты	758,38
1 расійскі рубель	82,83
1 украінская грыўня	427,21

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,8964
10 UAH	51,3879
1000 BYR	12,0420
EUR	34,8358

Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.05.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падлічыцца на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у радзільні па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

КАЛЕКТЫЎ ПІЎ У ПСІХАНЕЎРАЛАГІЧНЫМ ІНТЭРНАЦЕ?

У самы разгар працоўнага дня супрацоўнікі Полацкага міжраённага КДК пры правядзенні рэйду зафіксавалі, што 23 супрацоўнікі Полацкага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў разам з кіраўніком распівалі спіртныя напоі. Адпаведны матэрыял па дзенаму факту быў накіраваны ў Віцебскі аблвыканкам для прыняцця мераў. У камітэце нагадваюць, што згодна з Дырэктывай Прэзідэнта № 1 «Аб мерах па ўзмацненню грамадскай бяспекі і дысцыпліны», за п'янства ў рабочы час прадугледжана скасаванне кантрактаў з работнікамі, а з кіраўнікамі — нават за ўтойванне такіх і іншых фактаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Прамая лінія

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

На пытанні «прамой лініі» адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Васільеўна ШЭМЕТАВЕЦ.

(Працяг. Пачатак у нумары за 23 мая.)

☎ — Патлумачце, калі ласка, ці ёсць якія-небудзь перавагі ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у маці-адзіночкі?

Яўгенія Хрысанаўна, *Шаркаўшчынскі раён*

— У чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў для маці, што адна выхоўвае дзіця, якіх-небудзь пераваг ці льгот у нас няма.

☎ — Летам мінулага года майму сыну, інваліду III групы, споўнілася 18 гадоў, і ён стаў на ўлік у службе занятасці насельніцтва. Прайшло ўжо шмат часу, аднак дапамагчы з працаўладкаваннем яму так і не змаглі, таму сын атрымлівае толькі маленькую пенсію па інваліднасці. Што нам рабіць у такой сітуацыі?

Лілія Іванаўна ТОЎСЦІК, *г. Беразіно*

— Знайсці работу ў невялікіх гарадах сапраўды цяжка. І асабліва — чалавеку з абмежаванымі магчымасцямі. Тым не менш, Лілія Іванаўна, пытанні працаўладкавання вырашаюцца толькі на месцы. Таму працягвайце звяртацца ў раённую службу занятасці, або, як варыянт, звярніцеся ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама — магчыма, вам здолеюць дапамагчы менавіта там.

☎ — Здаецца, раней быў такі закон — спагнанне аліментаў з бацькі робіцца да таго часу, пакуль дзеці не закончаць навучанне ў ВНУ. Чаму гэты закон змяніўся, і чаму зараз выплата аліментаў адбываецца толькі да 18-гадовага ўзросту?

Таццяна Іванаўна, *г. Верхнядзвінск*

— Ранейшага закона, які абавязвае бацьку плаціць аліменты да моманту заканчэння дзіцем ВНУ, прынамсі, я не ведаю. Разам з тым праблема, якую вы ўзнімаеце, сапраўды слушная. І тут можна сказаць наступнае — зараз разглядаюцца варыянты змяненняў у Кодэксе аб шлюбе і сям'і. Прычым адна з прапаноў на самай справе датычыцца працягу выплаты аліментаў на дзіця, якое працягвае навучанне, да 23-гадовага ўзросту. Аднак, Таццяна Іванаўна, варта заўважыць, што пакуль гэта — толькі прапанова.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ

☎ — Адна выхоўваю дваіх дзяцей, адзін хлопчык ужо школьнік, а другі нарадзіўся летась. Патлумачце, калі ласка, каму выплачваецца дапамога па догляду дзіцяці, якому ўжо споўнілася 3 гады? І яшчэ. Хто мае права на бясплатнае дзіцячае харчаванне?

Марына Фёдараўна КАВАЛЬЧУК, *Віцебскі раён*

— Права на атрыманне дапамогі на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады залежыць ад узроўню даходаў. І калі сукупны штомесячны даход на кожнага члена сям'і за папярэдні год не перавышае 60 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму ў цэнах леташняга верасня, то дапамога па догляду дзіцяці ва ўзросце звыш 3 гадоў выплачваецца ў поўным памеры. А калі сукупны штомесячны даход на кожнага члена сям'і за папярэдні год не перавышае 80 працэнтаў БПМ, то дапамога па догляду выплачваецца ў памеры 50 працэнтаў. У прыватнасці, зараз выплата дапамогі на дзіця ва ўзросце больш за 3 гады робіцца ў поўным памеры, калі сярэднямесячны даход на аднаго чалавека ў сям'і за 2006 год склаў 101 760, а ў памеры 50 працэнтаў — 135 680 рублёў.

Пры гэтым варта адзначыць, што дапамога на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады ў гэтым канкрэтным выпадку выплачваецца па месцы работы маці. А калі вы не працуеце, то выплата робіцца ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

А зараз наконт бясплатнага харчавання на дзяцей ад нараджэння да 2 гадоў. Яно можа прадастаўляцца незалежна ад катэгорыі бацькоў. Аднак зноў-такі з улікам даходу — для забеспячэння бясплатным харчаваннем неабходна, каб даход на кожнага члена сям'і ў месяц не перавышаў 60 працэнтаў цяперашняга бюджэту пражыткавага мінімуму. Ці на сёння — 107 460 рублёў.

Рашэнне аб прадастаўленні бясплатнага харчавання прымаецца раённай камісіяй па прызначэнню адраснай сацыяльнай дапамогі на кожныя шэсць каляндарных месяцаў з моманту падачы заявы — да дасягнення дзіцем 2-гадовага ўзросту. Дарэчы, звяртацца па прызначэнне бясплатнага харчавання на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў трэба ва ўпраўленне па працы і сацыяльнай абароне або ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства.

☎ — У мяне крыху незвычайная сітуацыя, таму вырашыла звярнуцца да вас. Справа ў тым, што мы з мужам узялі шлюб і ў нас нарадзілася дзіця. Потым муж пайшоў у другую сям'ю, дзе ў яго з'явіліся яшчэ двое дзяцей. Аднак здарылася так, што сёлета яго жонка памерла, і зараз я, муж разам з нашым агульным дзіцем і двума дзецьмі ад другога шлюбу жывём разам. А пытанне такое: якія нашы даходы павінны ўлічвацца для прызначэння дапамог на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады?

Ірына Пятроўна, *г. Лунінец*

— У такой па-сапраўднаму няпростай сітуацыі вам, Ірына Пятроўна, лепш за ўсё звярнуцца да спецыялістаў раённага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, якія павінны дапамагчы разабрацца, як кажуць, з улікам усіх нюансаў.

☎ — Сын і нявестка маёй калегі па рабоце — студэнты дзённага аддзялення ВНУ. Хутка ў іх павінна з'явіцца дзіця. У сувязі з гэтым патлумачце, ці павінны нявестцы аплаціць бальнічны па цяжарнасці і родах, ці зможа яна разлічваць на атрыманне дзіцячай дапамогі? І якія льготы існуюць для сем'яў з дзецьмі, дзе муж і жонка — студэнты?

Галіна Паўлаўна МУРАВЕЙКА, *г. Мінск*

— Па-першае, студэнтка мае права на атрыманне па месцы навучання дапамогі па цяжарнасці і родах. Яе памер складае стыпендыю, аднак пры гэтым — не менш за 50 працэнтаў ад бюджэту пражыткавага мінімуму. Далей. Дапамога па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў студэнтцы выплачвацца будзе, прычым афармляецца яна зноў-такі па месцы навучання. Дарэчы, адначасова там жа можна аформіць і свабоднае наведванне — інакш кажучы, атрымліваць у поўным памеры і дапамогу, і стыпендыю.

Нарэшце, па апошняму пытанню. Якіх-небудзь агульных ільгот для сем'яў з дзецьмі, дзе бацькі з'яўляюцца студэнтамі дзённага аддзялення, няма — пэўныя льготы могуць быць вызначаны толькі на ўзроўні канкрэтнай навучальнай установы. Разам з тым паспрабуйце падлічыць даходы і высветліць, ці можа разлічваць такая сям'я на бясплатнае харчаванне на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, або на адрасную сацыяльную дапамогу. Да слова, зараз адрасная сацыяльная дапамога прызначаецца без уліку катэгорый толькі пры адной ўмове — памер даходу кожнага члена сям'і не павінен перавышаць 60 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму. А гэта на сёння — 107 460 рублёў.

(Працяг будзе.)

Сяргей ГРЫБ.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **77** дзён

Фота БелТА

ГАЗЕТА ПРА ЛЮДЗЕЙ І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

«Звязду» я пачаў чытаць са студэнцкіх гадоў і вось з той пары сябрую з газетай.

Хачу адзначыць, што «Звязда» з тых газет, якія ўмеюць проста і даступна падаць інфармацыю. Імпануе і тое, што газета піша пра простага чалавека. Сапраўды, выданне для людзей і пра людзей.

Нарысы па гісторыі, артыкулы па абрадах, народных традыцыях, якія друкуюцца на старонках газеты, выконваюць выхаваўчую функцыю.

І яшчэ. «Звязда» неабыякавая да праблем Палесся, да жыцця палешукоў, і гэты факт вельмі важны для нас. Ды і прачытаць пра будні свайго раёна заўсёды прыемна.

У маёй сям'і таксама нераўнадушныя да старэйшай беларускай газеты — часта звяртаюцца да яе парад.

Будзем памятаць, што «Звязда» ніколі не здраджвала роднай мове. Спадзяюся, што і надалей будзе так. Зычу калектыву газеты ўсяго найлепшага.

Уладзімір СТОЛЯР,
старшыня Ганцавіцкага райвыканкама.

Афіцыйна

Прастора для культуры

Краіны — удзельніцы СНД зацікаўленыя ў шматбаковых культурных праграмах, што рэалізуюцца на тэрыторыі дзяржаў Садружнасці. Гэты тэзіс стаў лейтматывам XXII пасяджэння Савета па культурнаму супрацоўніцтву дзяржаў — удзельніц СНД.

У пасяджэнні, што праходзіла ў адным з культурных цэнтраў беларускай сталіцы — Нацыянальнай бібліятэцы, — узялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Узбекістана і іншых дзяржаў. Цэнтральнымі пытаннямі сустрэчы сталі развіццё культурнага турызму і абмен вопытам, выпрацоўка адзіных падыходаў у заканадаўстве па ахове культурнай спадчыны, уніфікацыя падрыхтоўкі кадраў у галіне культуры. Апошні пункт прадугледжвае, напрыклад, стварэнне Асацыяцыі вышэйшых музычных навучальных устаноў дзяржаў СНД. Прыводзіць да агульнага знаменальніка падрыхтоўку спецыялістаў, як падкрэсліў міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук, неабходна яшчэ і таму, што профільныя навучальныя ўстановы часта падпарадкоўваюцца розным міністэрствам, адпаведна і патрабаванні да падрыхтоўкі кадраў зусім розныя.

«На тэрыторыі краін СНД у культурнай палітыцы існуе адзінства поглядаў і падыходаў, уменне знаходзіць кансэнсус і жаданне рэалізоўваць вельмі сур'ёзныя і грунтоўныя праекты ў галіне культуры», — адзначыў старшыня Савета па культурнаму супрацоўніцтву дзяржаў — удзельніц СНД, міністр культуры і турызму Азербайджана Абульфаз Гараеў. Адным з такіх праектаў стане выданне зборніка маладых аўтараў з розных краін СНД. Выданне яго возьме на сябе расійскі бок. Спачатку зборнік выйдзе на рускай мове, потым будзе перакладзены таксама на ўсе нацыянальныя мовы. Знайшла водгук у міністраў культуры дзяржаў Садружнасці і ініцыятыва Кыргызстана, дзе створаны Цэнтр эпічных герояў, — аб насычэнні Цэнтра культурнай спадчынай іншых краін. Дэталёва абгаворвалася супрацоўніцтва ў галіне міжнародных конкурсаў і фестываляў. Плануецца таксама аб'яднаць намаганні краін па сумеснай кінавытворчасці. Праўда, пакуль гэтыя дамоўленасці сведчаць толькі аб гатоўнасці нацыянальных кінастудый да супрацоўніцтва, а паскарэнне працэсу залежыць найперш ад фінансаў: усё ж кінаіндустрыя — гэта не толькі культурная з'ява, але і бізнэс.

Бліжэйшым з праектаў расійска-беларускага супрацоўніцтва, паводле слоў міністра культуры і масавых камунікацый Расіі Аляксандра Сакалова, стане фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Прадугледжаны таксама шэраг сумесных праектаў у архіўнай, музейнай, экспазіцыйнай, бібліятэчнай справе, падпісана двухбаковае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне СМІ. Будзе ўзяты на ўзбраенне вопыт арганізацыі дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — паводле прызнання замежных калег, беларуская бібліятэчная сістэма працуе надзвычай зладжана і эфектыўна.

Адной з важных праблем, якую адзначылі удзельнікі пасяджэння, стаў крызіс чытання. Аб гэтым красамоўна сведчаць лічбы па Расіі: на пачатку 90-х гадоў у 80 працэнтах сем'яў бацькі чыталі дзецям кнігі, сёлета такіх сем'яў — толькі 7 працэнтаў. На думку міністраў культуры розных краін, крызіс не разбурыць шматгадовую традыцыю шырокага азнаямлення з літаратурнай спадчынай, калі своечасова спахапіцца і перагледзець увесь ланцуг удзельнікаў літаратурнага працэсу, ад профільных ВНУ, паэтаў і пісьменнікаў да кнігавыдаўцоў і ўласна чытачоў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота БелТА

ПРА БЯДУЛЮ ЗНЯЛІ КІНО

Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Бядуля сёння адзначае 80-гадовы юбілей

Уладзіміра Лявонавіча Бядулю, былога старшыню ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарча-вытворчага кааператыва «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна прадстаўляць асабліва не трэба. Яго ведаюць ва ўсіх кутках былой вялікай краіны. Вось і рэжысёр Анатоль Алай першапачатковую іншую назву свайго новага фільма замяніў на кароткую і ёмістую «Уладзімір Бядуля».

Прэм'ерны паказ стужкі майстра дакументалістыкі адбыўся на гэтым тыдні ў Рэспубліканскім доме кіно. Гэтаму папярэднічаў год работы здымачнай групы.

Фільм дастаўся аўтарскаму калектыву не без цяжкасцяў. І галоўная з іх — у час здымання прыйшла навіна аб тым, што нязменны на працягу паўстагоддзя старшыня «Савецкай Беларусі» — ужо не старшыня. Давялося на ходу мяняць і канструкцыю, і канцэпцыю самой карціны. Але з'вілася нагода больш паслухаць людзей, паспрабаваць зразумець цераз іх успрыманне, што ж добрага пакінуў пасля сябе чалавек-эпоха Бядуля.

Пра былога расненскага старшыню ёсць цэлыя раздзелы ўспамінаў у кніжках розных аўтараў. Так Міхаіл Шымансі ў творы «Прыйсці і пакланіцца» прыводзіць выказванні Анатоля Карпава, Уладзіміра Мулявіна і цэлага шэрагу знакамітасцяў савецкай эпохі. Бядулю ведаюць Аляксандра Пахмутава і Мікалай Дабранраваў, Валерый Лявонцьеў і Людміла Зыкіна. Але рэжысёр Анатоль Алай акцэнт робіць на сінхронных інтэрв'ю з простымі людзьмі, калгаснікамі «Савецкай Беларусі». Даяркі Лідзія Алімпіюк, Ніна Шкутнік, Ганна Лукашэвіч, брыгадзір паляводчай брыгады Вольга Грыцук, брыгадзір піларамы Міхаіл Раманюк, іншыя вяскоўцы пакрысе, па слоўцу складваюць партрэт чалавека і кіраўніка.

Гэты партрэт дапаўняюць выказваннямі старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, старшыня цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. У фільме выкарыстаны вялікі архіўны матэрыял, у тым ліку прадстаўлены тэлерадыёкампаніяй «Брэст». Крытыкі адзначылі ўдалае музычнае суправаджэнне карціны: выкарыстаны творы Чайкоўскага, Грыга, Малера.

У шырокай глядацкай аўдыторыі знаёмства з фільмам наперадзе. Сам герой выказаў задавальненне прэм'ерай. Бядуля і цяпер, як і раней, гэтакі жвавы і няўрымслівы. Дома Уладзіміра Лявонцьевіча не заўсёды застанеш. Ён то ў Мінску, то ў Маскве па мноству грамадскіх спраў, якія ў яго засталіся. У яго шмат розных задумак, праектаў, планаў. Ну і на сям'ю, нарэшце, з'явілася больш часу. Шаноўнага юбіляра будуць віншаваць надзейная спадарожніца яго жыцця Аніся Трафімаўна, дочкі, сын, іх сем'і. Дарэчы, у іх вялікую агульную сям'ю нядаўна прыйшло папаўненне. У малодшай дачкі Людмілы нарадзілася дачушка Насця. «Звязда» шчыра віншуе з юбілеем героя сваіх шматлікіх публікацый. Здароўя Вам, Уладзімір Лявонцьевіч!

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У суд Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **МАЛАШЭНКІ Андрэя Пятровіча**, 25 кастрычніка 1969 года нараджэння, ураджэнца ст. Крулеўшчызна Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — вёска Крулеўшчызна Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці (па стану на 10 сакавіка 2005 года).

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра А.П. Малашэнку, паведаміць іх суду Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Супрацоўніцтва

Аляксандр Лукашэнка адзначае асаблівую дынаміку развіцця адносінаў Беларусі і Азербайджана

Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам Дзён культуры Азербайджана ў Беларусі.

«Беларусь і Азербайджан звязваюць даўнія і трывалыя вузы дружбы і супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах. Сёння нашы адносіны развіваюцца асабліва актыўна і дынамічна ў інтарэсах абедзвюх дзяржаў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Няхай гэта творчая акцыя паслужыць пашырэнню і паглыбленню духоўных і культурных сувязяў, далейшаму збліжэнню нашых краін».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Роздум пасля суда

СІНДРОМ ЖАЗЛА

У гэтым месяцы Брэсцкі абласны суд пакінуў рашэнне Ганцавіцкага раённага суда ў сіле і былы ўчастковы інспектар Ю. Будчанін адправіўся на 4 гады ў папраўчую калонію ўзмоцненага рэжыму.

Прыгавор суда не ўсе ў раёне ўспрынялі адназначна. Адны шкадуюць старшага лейтэнанта, а другія, наадварот, лічаць, што пакаранне заслужанае.

Дык за што атрымаў былы міліцыянер такі суровы прыгавор?

Калі паглядзець на гэты канфлікт збоку, то ён быццам бы не заслугоўвае ўвагі, а калі паразважаць, то можна прыйсці да высновы, што за ім стаіць сур'ёзная праблема.

Вернемся ў лістапад 2006 года і будзем прытрымлівацца фактаў, устаноўленых следствам і судом.

Сігнал у Ганцавіцкі РАУС паступіў з вёскі Локтышы каля 13 гадзін. Пенсіянерка Ірына Коўш паведаміла, што ў яе ўкралі 10 тысяч і бутэльку пярцовай настойкі. Дзяжурны перадаў інфармацыю ўчастковаму інспектару, і ў 18 гадзін Юрый Будчанін прыехаў у Локтышы.

Тут і высветлілася, што ў І. Коўш знаёмы Г. украў толькі бутэльку настойкі, а грошай не чапаў. Сваю памылку жанчына прызнала, як і Г. не адмаўляўся ад таго, што ўзяў са стала тую пляшку (доўг за сушаныя грыбы). У хаце яшчэ знаходзіўся і М. Моталь, з якім І. Коўш жыве разам.

Здавалася б, усё зразумела, — людзі свае, знаёмыя, выпілі, а непаразуменне, якое паміж імі ўзнікла, магчыма, само сабой «рассмакталася» б. Участковаму трэба было скласці пратакол, зрабіць удзельнікам канфлікту ўнушэнне і пакінуць хату. Але справа набыла нечаканы паварот, бо Ю. Будчанін уступіў у палеміку з падпіўшай жанчынай. Міліцыянеру не спадабаліся паводзіны жанчыны і ён «...прыняў незаконнае рашэнне аб дастаўцы Коўш І. І. у г. Ганцавічы для медыцынскага агляду і размяшчэння ў ізалятар часовага ўтрымання Ганцавіцкага РАУС».

Ю. Будчанін сцвярджаў, што жанчына была п'яная і нецэнзурна выказвалася. Вось участковы і вырашыў адвезці І. Коўш у райбальніцу для вызначэння яе стану.

Міліцыянер надзеў на жанчыну наручнікі і павёў да машыны, там дзверцай былі ёй прыціснуты пальцы правай нагі, бо залезці ў машыну з хворымі нагамі дыяшчэ ў наручніках аказалася няпроста. Адным словам, з пацярпелай І. Коўш ператварылася ў затрыманую. Цікавы адзін момант. Надзець наручнікі падштурхнула ўчастковага сама пенсіянерка. «Калі я злачынца, то надзень на мяне наручнікі», — сказала І. Коўш і выставіла перад сабой рукі. У гэты момант Ю. Будчанін і зашчоўкнуў наручнікі на запясцях жанчыны. Праўда, ён затым сцвярджаў, што ніякіх спецыяльных сродкаў да пенсіянеркі не прымяняў, але суд прыйшоў да процілеглага заключэння.

А вось што паказаў медыцынскі агляд. У пратаколе за № 594 запісана: «... звязнасць і моўныя здольнасці Коўш І.І. не парушаныя, у прасторы, часе і асобе ніхто не паверыць. Чаму І. Коўш апынулася ў ізалятары? Спасылка на позні час — у Локтышы ўжо не было аўтобуса. Але ж як прывёз, то так трэба было і адвезці.

І. Коўш у мінулым працавала настаўніцай рускай мовы, але стаўленне аднаяскоўцаў да яе неадназначнае — персанаж не зусім станоўчы. І ўсё ж даказаць, што пенсіянерка любіць выпіць, на судзе не ўдалося. Ніякіх пратаколаў, абследаванняў, затрыманняў не аказалася, як і ніхто са сведак не падцвердзіў, што І. Коўш абзывала міліцыянера.

Прасцей кажучы, Ю. Будчанін сам стварыў праблему і апынуўся з ёю адзін на адзін.

Але чаму за свайго калегу не заступілася міліцэйскае начальства? Чаму справа дайшла да суда? Выдалі Ю. Будчаніну станоўчыя характарыстыкі, дапамаглі з адвакатам... і вывелі са штату.

Відавочна, у міліцыі не думалі, што ў справы будзе такі фінал.

Нельга адмаўляць, што ў міліцыі на першым плане работа па факту, а прафілактыка — на другім. Напэўна ж, і Ю. Будчанін ведаў, хто ёсць хто ў тых жа Локтышах і павінен быў мець нейкія напрацоўкі для работы з праблемным кантынгентам вёскі.

Даводзілася чуць ад міліцэйскага кіраўніцтва розных рангаў, што міліцыя — зрэз нашага грамадства. Маўляў, у міліцыю маладыя людзі прыходзяць з нашых жа вёсак і гарадоў — ідэальных узяць няма дзе. І гэта праўда, як і тое, што даволі часта нават міліцэйскія афіцэры не спяшаюцца сказаць: «Прабачце, якая ў вас праблема?», «Чым я магу вам дапамагчы?», «Прабачце, але вы парушылі...» Асабіста мне такіх слоў не даводзілася чуць. І такім простым рэчам неабходна супрацоўнікаў вучыць.

Кожны міліцыянер ведае, што закон на яго баку. Гэта як жазло ў руках супрацоўніка ДАІ. Які вадзіцель пасмее не падпарадкавацца ўзмаху жазлом, а хто з грамадзян будзе пярэчыць чалавеку ў форме? Упэўненасць Ю. Будчаніна ў законнасці сваіх дзеянняў і стварыла для яго вялікую праблему. Хоць калі падысці да гэтага здарэння без эмоцый і ўзважыць усе «за» і «супраць», то становіцца шкада хлопца — трапіў у бяду за «панюшку тытуню». Праўда, па гэтаму артыкулу Крымінальнага кодэкса Беларусі можна атрымаць да 10 гадоў калоніі, але гэта ўжо верхняя планка.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Ганцавіцкі раён.

МТС — аграгарадкам

ШУМІЦЬ РАЙЦЭНТР, ДЗЕ ЛЕС ШУМЕЎ...

Шумілінскі раён знаходзіцца ў цэнтральнай частцы Прыдзвінскага краю. Гэта сапраўдны лясны край, бо амаль трэцяя частка тэрыторыі — лес. Але ж лес — не перашкода для абанентаў МТС, якія заўсёды застаюцца на сувязі! Мяне вельмі цікавіла, як сёння на Шуміліншчыне развіваюцца вёскі. І я выправіўся ў дарогу.

1

Знакавай падзеяй летась было адкрыццё аўтавакзала ў райцэнтры *(на здымку 1)*. Гэтыя новыя «вароты» ў гарадок разам са старым чыгуначным вакзалам, гісторыя якога перавышае 140 гадоў (!), быццам сімвалізуюць сувязь паміж новым і мінулым, развіццё раёна ў цэлым, яго адкрытасць і сучаснасць...

Мясцовыя жыхары расказвалі пра адну з версій з'яўлення назвы райцэнтра. Быццам бы слова «шуміліна» ўзнікла пасля падзей вайны супраць напалеонаўскіх захопнікаў. Маўляў, французскі атрад праз лес накіроўваўся ў бок Віцебска, ды трапіў у засаду. І амаль што ўсе французы былі знішчаны. І шумеў лес, ды так, што можна было пачуць далёка. Потым месца бою пачалі называць Шумным борам, а вёсачку, што з'явілася тут — Шумным сялом.

Шуміліншчына мае багатую гісторыю. У другой палове XVI стагоддзя на тэрыторыі сучаснага раёна па загаду Івана Грознага актыўна пачалі будаваць крэпасці — драўляныя і мураваныя, якія не захаваліся да нашых дзён. Але ж выявы іх у архівах ёсць...

У наш час тут зроблена шмат добрага. Да 2010 года ў раёне павінны адкрыцца 9 аграгарадкоў. Першы з іх стварылі ў вёсцы Башні, што кіламетраў за 10 ад райцэнтра, дзе жывуць каля 400 чалавек. Па суседству з райцэнтрам знаходзіцца Светласельскі аграгарадок. Тут працаўнікі жывуць у прэзентабельных катэджах, якія не могуць не здзіўляць сваёй знешняй прыгажосцю і ўтульнасцю ўнутры *(на здымку 2)*. Добрыя дарогі, добраўпарадкаваныя вуліцы.

Наступны гістарычны факт з ліку тых, што зацікавілі мяне ў Шуміліне. Вядома, што ў мінулым стагоддзі абрэвіятура «МТС» значыла: машынна-трактарная станцыя. Дык вось. У раённай газеце за люты 1945 года пісалі аб пасяджэнні савета Сірацінскай МТС (так да 1961 года называўся раён). Дырэктар той МТС і іншыя ўдзельнікі гэтага мерапрыемства падкрэслівалі: «...вялікае значэнне МТС у справе адраджэння нашых калгасаў і выключную яе ролю ў паспяховым правядзенні веснавой сяўбы... Прыклады народнай будоўлі ў Нагінскай і ў многіх іншых МТС гавораць аб тым, што наш народ можа тварыць цуды, трэба толькі творчую энергію яго накіроўваць у неабходнае рэчышча»... Далей гаворыцца аб тым, што трэба перайманць прыклады перадавых МТС: «вырашылі сіламі калгасаў адбудаваць да 15 сакавіка кантору, гараж, кладоўку, а да 1 красавіка — будынак для майстэрні. Наперадзе вялікая работа, якую трэба завяршыць у параўнальна сціслы тэрмін»...

Сотавая кампанія МТС у нашы дні аператыўна займаецца «мабілізацыяй» краіны і вёскі ў прыватнасці. Зараз МТС на Шуміліншчыне — гэта надзейнае пакрыццё мабільнай сувяззю, даступнасць паслуг, прывабныя тарыфы для ўсіх. МТС мэтанакіравана развівае радыёпакрыццё ва ўсіх раёнах і канкрэтна на Шуміліншчыне.

2

Вандруючы па Шумілінскім краі, завітаў у Башні, дзе стаіць адна з базавых станцый сувязі МТС. У гэтым аграгарадку, што на беразе возера Будавесць, прыгожа і чыста. Заасфальтаваныя вуліцы, адрамантаваны дамы, пабудаваны новыя. Мясцовая гаспадарка працуе паспяхова. Атрымалі новае жыццё майстэрні, фермы. Калі праца ёсць у гаспадарцы, дзе добрая зарплата, створаны гарадскія ўмовы для жыцця, — аграгарадок чакае паспяховая будучыня. Вельмі ўтульна ў вясковым Доме культуры; ФАП і будынак пошты прыведзены ў парадак. Школу капітальна адрамантавалі. Вучні з задавальненнем наведваюць заняткі, у тым ліку і ў камп'ютарным класе. Заўсёды шмат задаволеных наведвальнікаў у вясковым кафэ, у краме. Вельмі запатрабаваны паслугі пральні, швейнай майстэрні.

МТС для жыхароў такіх аграгарадкоў, як Башні, — магчымасць карыстацца перадавымі тэхналогіямі ў вобласці сувязі. Тыя, хто мае мабільныя тэлефоны, могуць з дапамогай «Мабільных ТэлеСістэм» патэлефанаваць фактычна ў любы пункт свету. Нават знаходзячыся на прыродзе, можна выйсці ў «супутнікавае павуцінне», закачаць прыемную мелодыю і г.д.

Сёння МТС, як калісьці яго цёзка, мае вялікае значэнне для вёскі. МТС таксама аб'ядноўвае тых, хто ў дарозе, і ўсіх, каму заўсёды патрэбна надзейная сувязь.

Вядучы рубрыкі
Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ва ўрадзе

ДЛЯ ЗААХВОЧВАННЯ ПЕРАМОЖЦАЎ СПАБОРНІЦТВА ПА ЎБОРЦЫ ЗБОЖЖА І НАРЫХТОЎЦЫ КАРМОЎ ВЫДЗЯЛЯЕЦЦА BR8 МЛРД

Для ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы травяных кармоў у гэтым годзе зацверджана 386 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі і каштоўнымі падарункамі, у тым ліку ўдзельнікам жніва будзе ўручана 277 ганаровых дыпломаў. Рашэнне аб гэтым змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 595 ад 15 мая 2007 года.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, рэспубліканскае спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых, нарыхтоўцы кармоў і вырошчванні лёну праводзіцца штогод. У яго рамках арганізаваны рэспубліканскі агляд-конкурс павышэння культуры земляробства. Вынікі спаборніцтва і агляду-конкурсу падводзяцца на фестывалі-кірмашы «Дажынкі». Тут жа пераможцы атрымліваюць свае ганаровыя дыпломы і каштоўныя падарункі.

У Мінсельгасхарчы растлумачылі, што затраты на правядзенне спаборніцтва праводзяцца за кошт сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі сельгасвытворцаў. Сёлета на гэтыя мэты прадугледжана выдзеліць Br8 млрд.

Для пераможцы сярод абласцей заснаваны 1 ганаровы дыплом з грашовай прэміяй у суме Br50 млн. Сярод раёнаў — 6 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі па Br30 млн кожная. Калі па выніках спаборніцтва пераможцамі выходзяць два раёны, адзін з якіх за апошнія пяць гадоў, уключаючы 2007 год, станавіўся пераможцам такога спаборніцтва, то і гэты раён узнагароджваецца ганаровым дыпломам і грашовай прэміяй, якія заснаваны для гэтага дадаткова.

Для ўзнагароджання пераможцаў сярод сельгаспрадпрыемстваў заснавана 18 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі. Так, прэмія за першае месца складзе Br20 млн, за другое — Br15 млн, за трэцяе — Br10 млн. Калі па выніках спаборніцтва на першае месца выйдуць дзве арганізацыі, адна з якіх за апошнія 5 гадоў, уключаючы 2007 год, станавілася пераможцам такога спаборніцтва, то і гэта арганізацыя будзе ўзнагароджана ганаровым дыпломам і грашовай прэміяй у суме Br20 млн, якія заснаваны для гэтага дадаткова.

Пераможцаў спаборніцтва сярод галоўных аграномаў у аглядзе-конкурсе павышэння культуры земляробства чакаюць 12 ганаровых дыпломаў з прэміямі ў суме Br5 млн кожная. У такім жа памеры будзе заахвочана праца лепшых галоўных інжынераў сельскагаспадарчых арганізацый.

Асаблівую цікавасць заўсёды выклікае спаборніцтва механізатараў. Для старшых камбайнераў механізаваных збожжаўборачных атрадаў, створаных пры арганізацыях, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку, заснавана 6 ганаровых дыпломаў і каштоўныя прызы (аўтамабіль — за першае месца, халадзільнік — за другое, маразільнік — за трэцяе). Пераможца сярод механізатараў, які займаў раней першае месца ў такім спаборніцтве, будзе ўзнагароджаны ганаровым дыпломам, камп'ютарам і грашовай прэміяй Br9 млн.

Лепшых памочнікаў камбайнераў мехатрадаў, створаных пры арганізацыях, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку, чакаюць 6 ганаровых дыпломаў і каштоўныя падарункі (камп'ютар — за першае месца, газавая пліта — за другое, тэлевізар — за трэцяе).

Пераможцы спаборніцтва сярод старшых камбайнераў сельгасарганізацый, акрамя ганаровых дыпломаў, за першае месца атрымаюць легкавы аўтамабіль, за другое — халадзільнік, за трэцяе — маразільнік.

Прадугледжаны таксама заахвочванні для камбайнераў сельгасарганізацый, якія працуюць у якасці памочнікаў, а таксама для старшых камбайнераў маладзёжных экіпажаў сельгасарганізацый і вадзіцеляў, якія перавозяць збожжа. Акрамя таго, распрацаваны ўмовы спаборніцтва на нарыхтоўцы кармоў. Пераможца сярод абласцей атрымае ганаровы дыплом і прэмію ў памеры Br50 млн, сярод раёнаў — заснавана 6 ганаровых дыпломаў з грашовымі прэміямі па Br30 млн кожная, сярод сельгасарганізацый — 18 дыпломаў з грашовымі прэміямі ў залежнасці ад занятага месца (за першае — Br20 млн, за другое — Br15 млн, за трэцяе — Br10 млн). Прадугледжаны ўзнагароды для старшых камбайнераў кормаўборачных атрадаў і іх памочнікаў, а таксама вадзіцеляў, занятых на перавозцы кармоў.

Утерянную лицензию № 12160/0154007, выданную 22 апреля 2004 года № 204 Ганцевичским РИК на имя ИП **ПЕЧЕНКИНА Сергея Геннадьевича**, считать недействительной.

Утерянное удостоверение инвалида II группы С15 № 0059213 на имя **ВАЙТЕХОВИЧ Г.В.** считать недействительным.

Страховые полисы ЗАСО «Кентавр» от несчастных случаев на время поездки за границу серии КЕ № 0064896, 0064901, 0065651, 0066493, 0066858, 0066949 (форма 2 РН) считать недействительными.

ЁСЦЬ БЕЛАРУСКІ ВАГОН!

Мінскі вагонарамонтны завод пачаў выпуск пасажырскіх вагонаў

Дырэктар Мінскага вагонарамонтнага завода Віктар ТАЛКАЧОЎ.

Для беларускай чыгункі гэта стала знакавай, прыемнай падзеяй. Дагэтуль уласнай вытворчасці вагоннага транспарту ў нашай краіне не было. Два першыя чыгуначныя «дзіцяці» ўжо сышлі з канвеера і будуць накіраваныя на абслугоўванне Брэсцкага напрамку.

Правадніца Алена КІЧУК. У новым вагоне — заўсёды добры настрой.

Нашы вагоны будуць каштаваць на 30 000 долараў танней, чым іх «калегі» з замежжа. На сёння расіяне з'яўляюцца фактычным манапалістам на рынку вытворчасці пасажырскага чыгуначнага транспарту на прасторах СНД. Але са з'яўленнем вагонаў мінскага завода сітуацыя можа змяніцца. Да іх ужо прыглядаюцца Украіна і Казахстан.

— Для казахстанскай чыгункі збіраемся набыць на наступны год каля 200 пасажырскіх вагонаў. Таму зараз прыглядаемся да магчымых вытворцаў. Мы ведаем аб Мінскім вагонарамонтным заводзе, дагэтуль быў намер папрацаваць з ім у напрамку рамонту чыгуначнага транспарту, аднак узніклі некаторыя тэхнічныя пытанні наконт дакументацыі. Справа ў тым, што ў кожнай краіне набор дакументаў для ажыццяўлення рамонту адрозніваецца. Сёння мы прыехалі, каб вывучыць прапанову аб набыцці вашых пасажырскіх вагонаў, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **віцэ-прэзідэнт казахстанскага АТ «Пасажырская лізінгавая вагонная кампанія» Нурлан ЖУМАБАЕЎ**.

— Ёсць намер наладзіць дзелавое супрацоўніцтва ў новым накірунку?

— Яшчэ пры Савецкім Саюзе ўсе рэспублікі мелі адзіную вагонарамонтную базу, таму можна лічыць, што мы ведаем адзін аднаго. Усё залежыць ад таго, у якіх аб'ёмах будзе наладжваць сваю вытворчасць Мінскі вагонарамонтны завод. А ўвогуле наша пазіцыя да партнёрства нармальная.

Магутнасць, на якую плануюць выйсці беларускія вытворцы, складае 60—70 айчынных вагонаў у год. Як расказаў **першы намеснік начальніка беларускай чыгункі Уладзімір ЛАПЦІНСКІ**, на сёння каля 80 працэнтаў чыгуначнага пасажырскага транспарту зношана.

— Дзякуючы з'яўленню гэтай вытворчасці мы плануем на працягу дзесяці гадоў абнавіць парк пасажырскіх вагонаў, — паведаміў ён. — Мы можам выпускаць вагоны любых тыпаў — плацкартныя, купэйныя, з VIP-памяшканнямі. Згодна з праграмай па стварэнню безбар'ернага асяроддзя, беларускі завод пачне выпускаць і вагоны, якія маюць спецыяльныя пад'ёмнікі, прыстасаванні і купэ для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Плануецца, што сёлета ў склад цягнікоў будзе ўключана пяць такіх вагонаў. У будучым іх колькасць з кожным годам стане павялічвацца.

Айчынныя плацкартныя вагоны адрозніваюцца ад вагонаў, якія ўжо эксплуатуюцца на чыгунках Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Грузіі, Азербайджана, Арменіі, Туркменістана, Узбекістана, Таджыкістана, Кыргызстана, Малдовы, Манголіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Румыніі, Балгарыі, Албаніі, Славеніі, Харватыі, Сербіі, Босніі і Герцагавіны, Македоніі, Грэцыі, Турцыі, Кітая, Вьетнама, Кубы, Манголіі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, Ірана, Ірака, Сірыі, Лібіі, Алжыра, Марока, Туніса, Егіпта, Эфіопіі, Нігерыі, Анголы, Замбіі, Зімбабвэ, Мексікі, Кубы, Бразіліі, Аргентыны, Чылі, Перу, Эквадора, Венесуэлы, Канады, ЗША, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Японіі, Паўднёвай Карэі, Індыі, Пакістана, Шры-Ланкі, Бангладэш, Непала, Афганістана

ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

ІДАЛ І СУД

Ідучы з жанчынаю, я знайшоў на дарозе вялікую купюру. Праз некалькі крокаў я падняў яшчэ адну такую ж банкноту, і яшчэ нахіліўся, і яшчэ пабагацеў...

«Такое ўражанне, што нехта бяжыць папарадзе цябе і раскідае грошы, каб ты толькі падбіраў. У мяне заўсёды была думка, што для адных людзей нехта раскідае грошы на шляху, а другім трэба працаваць і зарабляць дробныя капейкі. Ты не ведаеш, хто табе грошы кідае на дарозе?» — «Проста я не ляную\ся і не саромеюся нахіляцца і падбіраць капейку. Калі ты не будзеш ленавацца, і ў цябе з'явяцца грошы!» — «Не, не ўсё так проста. У гэтым ёсць нейкая таямніца. Не хочаш мне расказваць, не расказвай, але нехта бяжыць папарадзе і раскідае грошы, бяжыць і раскідае!»

Глупства, канешне, але я амаль паверыў у тое, што нейкая сіла сапраўды хоча, каб я так лёгка багацеў.

Аднаго разу мне патэлефанаваў даўні прыяцель — Ігар Цішын, які ехаў з Брусэля ў Гомель. Мы даўно не бачыліся і вырашылі папіць гарбаты і з'есці па яблычнаму штрудзелю. Захацелася пасядзець і паўспамінаць пра нашую маладосць, калі мы разам працавалі ў рэстаўрацыйных майстэрнях.

«А чаго ты, Ігар, з майстэрняў сышоў?» — «Зразумеў, што не зусім маё. Што болей не веру нашаму настаўніку — Алегу Хадыку. А калі ты не верыш настаўніку, цяжка з ім працаваць...» — «І ўсё?» — «Не зусім... Ты ж памятаеш, што там было? Вось і з табою яны абышліся не лепшым чынам...» — «Са мною? Я сам сышоў. Зразумеў, убачыў, адчуў, што больш не хачу хадзіць на работу ў сабор...» — «Во, якраз пра касцёл самае смешнае. Калі ты сышоў, нашы рэстаўратары сабраліся і пачалі абмяркоўваць, як адзначыць твой сыход. І яны прыдумалі: зрабіць твайго маленькага ідала, паставіць яго ў сутарэннях, каб падалей ад чужых вачэй, і прыносіць яму ахвяры. Як толькі ў цябе з'явіцца намер зрабіць нейкае зло, трэба кідаць твайму ідалу капеечку, каб ён супакоіў цябе...»

Аказваецца, вось хто ходзіць папарадзе мяне і раскідвае грошы! Гэта ідал, мой ідал, ідал Адама Глобуса. Зрабіўшы такое адкрыццё, я не мог не падзяліцца ім з той жанчынаю, з той Іраю, што пыталася ў мяне пра істоту, якая раскідае грошы на маіх дарогах.

«Адкуль рэстаўратары ведалі, што твайго ідала трэба ўлагоджваць грашыма, а не пароць іголкамі? Звычайна падобных ідалаў поруць іголкамі і паляць у агні, а тутака яму грошы насыпаюць...» Іра вырашыла раскапаць глыбей гісторыю стварэння грошалюбівага ідала...

«Быў у мяне канфлікт з рэстаўрацыйнымі майстэрнямі. Я толькі першы месяц у іх папрацаваў, і адразу ж узнік грашовы канфлікт. Бухгалтарка, налічваючы мне заробак, памылілася і дала мне на сто семдзесят чатыры рублі больш. А сто семдзесят чатыры рублі — стыпендыя студэнта за семестр, вялікія грошы. Я, вядома, узрадаваўся важкаму заробку. У мяне і думкі не ўзнікла пра нейкую там памылку. Праз тыдзень тая бухгалтарка спахапілася, пачала мяне прасіць, каб вярнуў рублі. А яшчэ варта сказаць, што рэстаўрацыйныя майстэрні былі ў той час вельмі рафінаванай установай, такой звышінтэлігентнай і звышінтэлектуальнай. Таму мая адмова вяртаць грошы прагучала як стрэл.

«Як не вяртае?» — « Чаму не вяртае?» — « Хто ён такі, каб не вярнуць?» — «Вы казалі пра суд?» — «Казалі?» — «А ён што?» — «Кажа «падавайце»?» — «Мы падамо на яго ў суд!!!»

І яны падалі на мяне ў суд. Паштарка прынесла позву і я распісаўся ў атрыманні. Па дарозе ў суд я зайшоў у цырульню і пастрыгся «пад нуль». Іду ў суд і ўяўляю: залу, суддзяў у чорных мантыях і чорных шапачках, пракурора ў шэрым гарнітуры і адваката ў белым пінжаку, бухгалтарку з чырвонымі вуснамі, публіку... Каля суда таўкліся прыцішаныя людзі, нейкія хуліганы з хуліганкамі, мамкі іхнія з таткамі. Во, думаю, публіка яшчэ тая, адпаведная маёй абнуляванай галаве. Знаходжу я нумар дзвярэй, пазначаны на позве, грукаю і заходжу. А там... Замест вялізнай залы там — маленечкі кабінет з адным сталом. За тым сталом сядзіць жанчына і ўсміхаецца. Такая прыязная жанчына, падобная да маёй мамы, бібліятэкаркі. Глянула тая жанчына ў нейкую папку і пытаецца...

«У цябе тата ёсць?» — «Ёсць. У мяне і тата ёсць, і мама ёсць». — «Тата з мамаю працуюць?» — «Працуюць!» — «А ты вучышся?» — «Вучуся і працую!» — «Давай зробім так: ты пойдзеш да таты і папросіш сто семдзесят чатыры рублі. Тата дасць табе сто семдзесят чатыры рублі, ты пойдзеш на пошту і пакладзеш іх вось на гэты рахунак... Табе дадуць квітанцыю. З гэтай квітанцыяй ты прыйдзеш да мяне, аддасі яе, і мы забудземся пра ўсю гэтую малапрыемную гісторыю...»

Я паслухаў жанчыну. Пайшоў да мамы, узяў у яе грошы і аднёс квітанцыю ў суд.

Цяпер можна зразумець, якая ў мяне склалася рэпутацыя сярод рэстаўратараў.

Дзякуючы бухгалтарскай памылцы, рэстаўратары і прыдумалі майго грошалюбівага ідала. Ён спраўна працуе, бяжыць папарадзе мяне і раскідае грошы. Адно непакоіць... Няўжо ідал раскідае грошы толькі ў той момант, калі ты рыхтуешся зрабіць зло?

Адам ГЛОБУС.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МИНСКСОРТСЕМОВОЩ»

производит выплату дивидендов в течение месяца, начиная с 4 июня 2007 г., с 8 до 17 часов (кроме субботы и воскресенья) по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.

Акционерам, не работающим в ОАО «МинскСортСемОвощ», дивиденды будут перечислены на лицевые счета в АСБ «Беларусбанк» по месту обмена чеков «Имущество» на акции.

Усміхнёмся!

Дзяўчаты, памятайце — чым далей у лес, тым меншая верагоднасць, што на шашлыкі.

☺

Жанчына ў гасцях у сяброўкі на дачы заўважае, што на градках пад вокнамі сядзяць толькі калючыя кактусы. Кажа гаспадыні:

— Правільна. Гэта, мабыць, спецыяльна — каб гэтыя нахабныя мужыкі ў акно не лезлі!

— Не, каб не выскачылі...

☺

Ніколі не ешце апошнюю катлету з патэльні: адной катлетай не наядзіся, а пустую патэльню давядзецца мыць.

☺

Тры браты садзяцца вячэраць. Апускаюць лыжкі ў капусту. Маўчанне.

Старэйшы:

— Та-ак...

Сярэдні:

— Ды не перашкодзіла б...

Малодшы:

— Дык што — я збегаю!

☺

Вучоныя вызначылі, што самая зразумелая мова на Зямлі — кітайскі. Яе разумеюць больш за 1,5 мільярда чалавек.

☺



— Доктар, я калі сплю, храпу.

— Моцна?

— Вельмі!

— І гэта перашкаджае вашай жонцы, так?

— Не, я не жанаты.

— Значыць, вы спіце адзін?

— Так.

— Дык у чым жа праблема?

— Мяне ўжо з пятага месца працы звальняюць!

У зацені помнікам цесна
І крокі жыцця не чутны.
Але па законах нябесных
Спяваюць адвечную песню
Атожылкі новай вясны.
Сутонне нямых п'едэсталаў
Развеецца сонечным днём,
Каб вольнае слова гучала
І ў зацені слухаў Купала,
Як мы яго песні пяём.

(Фотаздымак зроблены на Мінскіх вайсковых могілках, дзе пахаваны народны паэт Янка Купала).

ПРЫНЦЫПОВЫХ ЗМЕН НЕ БУДЗЕ

У Беларусі ў бліжэйшы час прынцыповыя змяненні ў правілы дарожнага руху ўносіцца не будуць. Аб гэтым заявіў намеснік начальніка аддзела навукова-метадычнага і прававога забеспячэння ўпраўлення Дзяржаўнай аўтаінспекцыі МУС Анатоль Сушко. Апошнім часам у грамадстве з'явіліся чуткі аб тым, што ПДР будуць зменены. «Гэтыя праўкі будуць мець толькі рэдакцыйны характар», — падкрэсліў ён. Так, у працэсе работы высветлілася, што ў некаторых пунктах правіл ёсць пэўныя розначытанні. Менавіта гэта і будзе падкарэктавана. Анатоль Сушко таксама адзначыў, што змяненні не будуць уносіцца ў пункты, што датычацца выкарыстання спецыяльных крэслаў для перавозкі дзяцей у аўтамабілях. Цяпер наяўнасць такіх прыстасаванняў мае рэкамендацыйны характар.

Марыя ГУЦАЛА, БЕЛТА.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

Аўтаінфарм

НЕБЯСПЕЧНАЯ СПЁКА

У сувязі са спякотным надвор'ем упраўленне Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны звяртаецца да вадзіцеляў з просьбай праявіць асцярожнасць.

Справа ў тым, што пры павышэнні тэмпературы ў кіроўцаў транспартнымі сродкамі прытупляецца ўвага, людзі становяцца млявымі і санлівымі. Найбольш негатыўны ўплыў аказвае спякота на асобаў, якія пакутуюць на сардэчна-сасудзістыя захворванні. Таму супрацоўнікі ДАІ раяць такім людзям, ды і астатнім вадзіцелям ажыццяўляць паездкі на далёкія адлегласці раніцай і пасля заходу сонца. Калі ж ваяж нельга адкласці, то трэба быць надзвычай уважлівымі і пільнымі, пазбягаць неабдуманых манеўраў, не перавышаць хуткасць, захоўваць інтэрвал і дыстанцыю руху.

РАМОНТНЫЯ РАБОТЫ

Паводле звестак прэс-службы Дэпартамента «Белаўтадар», на ўчастку дарогі «Мінск—Ашмяны—граніца Літвы» (ад 68-га да 78-га кіламетра) перакрыты рух транспартных сродкаў.

У сувязі з капітальным рамонтам дарогі праезд будзе забаронены аж да 31 кастрычніка. Аб'ехаць памянёны ўчастак можна будзе па аўтадарозе «Мінск—Валожын».

Аўтапрам

«SAMAND» НАБІРАЕ АБАРОТЫ

Сёлета на заводзе ЗАТ «Юнісон», што ў пасёлку Абчак Мінскага раёна, плануецца сабраць каля 2 тысяч іранскіх аўтамабіляў «Samand».

Нагадаем, што зборка іранскіх аўто пачалася ў Беларусі ў жніўні мінулага года і за гэты час з канвеера ў Абчаку сышло 192 іранскія «скакуны» (так перакладаецца слова «Samand»). Да 2009 года гэты аўтамабіль на 51 працэнт павінен будзе складацца з беларускіх камплектуючых. У тым ліку плануецца арганізаваць у нашай краіне цэх зваркі і фарбавання кузаваў гэтай «легкавушкі».

Аўтаакцыя

БЕРАЖЫЦЕ ДЗЯЦЕЙ!

Набліжаюцца летнія канікулы — самая небяспечная пара для маленькіх пасажыраў і пешаходаў. Менавіта таму Дзяржаўтаінспекцыя распачала рэспубліканскую прафілактычную акцыю «Усёй краінай за бяспеку дзяцей на дарогах!»

Паводле звестак упраўлення ДАІ МУС Беларусі, акцыя будзе доўжыцца да сярэдзіны верасня. На першым этапе супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі сканцэнтруюць асноўную ўвагу на інфармацыйна-тлумачальнай працы як сярод дзяцей, так і з дарослымі ўдзельнікамі дарожнага руху. Асноўная мэта акцыі — зменшыць узровень і цяжар наступстваў дзіцячага траўматызму на дарогах. Пакуль што падстаў для аптымізму няма. За першы квартал гэтага года ў ДТЗ загінулі 18 дзяцей, што на 50 працэнтаў больш, чым за аналагічны леташні перыяд. Яшчэ 139 маленькіх суграмадзян атрымалі траўмы. Гэта амаль на 4 працэнты больш, чым у мінулым годзе.

Аўтадаследаванне

ЧЫМ ПАТЫХАЕ АВАРЫЯ

Вучоныя з цэнтра хімічных даследаванняў Манэл (Філадэльфія) высветлілі, што на манеру кіравання аўтамабілем моцна ўплываюць розныя пахі.

Так, напрыклад, пах свежаскошанай травы правакуе вадзіцеля на перавышэнне хуткасці. Пах рамонку, жасміну і лаванды моцна расслабляе. Таксама даволі вераломны і пах новага аўтамабіля. Водар пластыку і іншых элементаў унутранага аздаблення выклікае пачуццё самаўпэўненасці, што нярэдка прыводзіць да аварый. Ёсць і карысныя для кіроўцаў пахі. Напрыклад, водар лімона, кавы, карыцы і марскога паветра дапамагае вадзіцелям сканцэнтравацца на дарозе.

Аўтарэйтынг

ЛЕПШЫЯ «СЛУЖБОЎЦЫ»

Нямецкі часопіс «Firmenauto» апублікаваў вынікі конкурсу на лепшы службовы аўтамабіль.

Журы, у якое ўвайшлі 150 менеджараў розных фірмаў, правяло тэсціраванне 70 мадэляў, «наматаўшы» агулам больш за 50 тысяч кіламетраў. Такім чынам, лепшым у кампакт-класе быў прызнаны «Golf Variant», сярод універсалаў першынствааў «Roomster», у сямействе ўсюдыходаў не было роўных «Audi Q7».

Аўтапрагноз

БУДЗЬЦЕ АСЦЯРОЖНЫ

Прычынай узнікнення аварыйных сітуацый на гэтым тыдні будуць найчасцей парушэнні Правілаў дарожнага руху з боку пешаходаў. Таму пры з'яўленні пешаходаў вадзіцелям трэба быць напагатове. Асноўнымі месцамі ДТЗ будуць галоўныя дарогі. А найбольш небяспечныя аварыі могуць здарыцца напрыканцы тыдня. Асабліва вялікая верагоднасць сутыкненняў транспартных сродкаў на «ажыўленых» скрыжаваннях.

24 мая магчымыя сутыкненні нават пры руху на малой хуткасці. Небяспекі для жыцця і здароўя такія аварыі не будуць несці. За выключэннем выпадкаў, калі ДТЗ адбудуцца з удзелам п'яных вадзіцеляў.

25 мая асцерагайцеся жывёл на дарозе, а таксама буйнагабарытных транспартных сродкаў. Сутыкненне з імі могуць мець цяжкія наступствы. Таксама вялікая верагоднасць аварый на чыгуначных пераездах.

26 мая аварыйныя сітуацыі можа стварыць кожны ўдзельнік дарожнага руху, які праігнаруе сігналы святлафора. Таму вельмі важна самому пільна сачыць за абстаноўкай. Пасля поўначы асцерагайцеся вадзіцеляў, якія рэзка мяняюць хуткасць і робяць рызыкоўныя манеўры.

27 мая месцам ДТЗ могуць стаць магістралі з інтэнсіўным рухам. Прычым магчымыя «ланцуговыя аварыі», калі памылка аднаго ўдзельніка дарожнага руху можа прывесці да шэрагу ДТЗ. Нявопытным вадзіцеляў пажадана пазбягаць складаных маршрутаў, а пешаходам пільна сачыць за дзецьмі.

Аўтажарт

У выніку эвалюцыі ў вадзіцеляў маршрутных таксі на спіне выраслі трэцяя рука і вока.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.54	21.19	16.25
Віцебск —	4.37	21.16	16.39
Магілёў —	4.44	21.10	16.26
Гомель —	4.49	20.58	16.09
Гродна —	5.11	21.33	16.22
Брэст —	5.19	21.26	16.07

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Іосіфа, Кірылы, Мяфодзія, Макея, Нікадзіма, Расціслава, Сафрона*

К. *Жанны, Зузанны, Магдалены, Марыі, Вінцента*

Месяц

Першая квадра

Месяц у сузор'і Дзевы

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+25 — +27 °С	МАСКВА	+22 — +24 °С
ВІЛЬНЮС	+24 — +26 °С	РЫГА	+23 — +25 °С
КІЕЎ	+31 — +33 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+14 — +16 °С

Без ападкаў

Дзве даты

24 мая

Сёння мы адзначаем Дзень славянскага пісьменства і культуры. Свята вядомае як Дзень памяці першанастаўнікаў славянскіх народаў роўнаапостальных братоў Кірылы і Мяфодзія (IX ст.), стваральнікаў славянскага алфавіту, першых помнікаў славянскага пісьменства і старажытнаславянскай літаратурнай мовы.



15 год да н.э. — нарадзіўся Гай Юлій Цэзар Германік, рымскі палкаводзец і дзяржаўны дзеяч. З кіраваннем Цэзара, які ўстанавіў рэжым аднаасобнай улады, звязаны апошнія гады рымскай рэспублікі. Імя Цэзара было ператворана ў тытул рымскіх імператараў, ад яго пайшлі словы «цар», «кесар», «кайзер».

1900 год — у Расіі на ваду спушчаны крэйсер «Аўрора», які затым стаў сімвалам рэвалюцыі. Карабель меў водазмяшчэнне 6730 т, даўжыню — крыху больш як 126 метраў, шырыню — 16,7 метра, экіпаж карабля складаўся з 570 чалавек.

Цытата дня:

«Калі б ты ведаў, з якой на самай справе крыніцы выцякаюць людскія меркаванні і інтарэсы да цябе, то перастаў бы дамагацца адабрэння і пахвалы людзей».

Аўгусцін Аўрэлій (354—430), хрысціянскі тэолаг і царкоўны дзеяч.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285-88-81

№ 14 (232)

ЛЕПШЫЯ ГАТУНКІ СУНІЦ

Суніцы садовыя, якія ўсе называюць клубніцамі, сваю назву атрымалі больш як 200 гадоў таму дзякуючы буйным ягадам у выглядзе «клубка». Дык вось, садаводу-аматару цяжка зарыентавацца і правільна падабраць гатунак суніц. Вялікай памылкай (самай распаўсюджанай) з'яўляецца тое, што садаводы аддаюць перавагу замежным гатункам: вунь якая прыгожая, хоць і ехала да нас доўга. Трэба памятаць, што суніцы садовыя — культура малазімастойкая, а большасць замежных і асабліва заходнееўрапейскіх гатункаў, як правіла, часта вымярзаюць. Вы можаце садзіць любыя гатункі, але падыходзіць усё ж трэба асцярожна, улічваючы іх паходжанне і магчымасці вырошчвання ў кліматычных умовах Беларусі. Такім чынам, вам дастаткова мець па 1—2 ранніх, сярэдніх і позніх гатункі, каб на працягу месяца і больш мець магчымасць есці свежыя ягады.

РАННІЯ ГАТУНКІ

Кокінскія ранніе. Гатунак раянаваны па Мінскай і Магілёўскай абласцях. Ягады сярэдняй масы, тупаканічныя, чырвоныя, бліскучыя, кісла-салодкія. У сырыя гады пашкоджваецца шэрай гніллю.

Мачужынка. Гатунак раянаваны па Брэсцкай вобласці, зімастойкі. Сярэдняя маса ягады 10 г, чырвоныя, бліскучыя, добрая транспартабельнасць.

Львоўскія ранніе. Гатунак раянаваны па Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. Ягады правільнай тупаканічнай формы, чырвоныя, бліскучыя, кісла-салодкія.

Паўлаўчанка. Гатунак раянаваны па Гомельскай і Магілёўскай абласцях, зімастойкі. Ягады сярэдняй велічыні, чырвоныя, кісла-салодкія, прыгодныя для ўжывання ў свежым выглядзе і для прамысловай перапрацоўкі.

ГАТУНКІ СЯРЭДНЯГА ТЭРМІНУ ВЫСПЯВАННЯ

Надзея. Гатунак раянаваны па Віцебскай вобласці, зімастойкі. Ягады тупаканічнай формы, светла-чырвоныя, кісла-салодкія, мякаць светла-аранжавая.

Раксана. Гатунак раянаваны па Віцебскай вобласці, зімастойкі, устойлівы да грыбковых хвароб. Ягады круглыя, чырвоныя, кісла-салодкія, мякаць аранжава-чырвоная.

Вента. Гатунак раянаваны па ўсёй рэспубліцы, зімастойкі, ураджайны, сярэднеўстойлівы да грыбковых захворванняў. Ягады буйныя (11—12 г) ад шырокакругла-канічнай да канічнай формы. Мякаць цёмна-чырвоная, сакавітая, кісла-салодкая, пахучая.

Дзяснянка кокінская. Гатунак раянаваны па ўсёй рэспубліцы. Ягады сярэдняй велічыні (8-9 г) тупаканічнай і шарападобнай формы, ярка-чырвоныя, кісла-салодкія.

Фестывальныя. Гатунак раянаваны па ўсёй рэспубліцы, высоказімастойкі, сярэднеўстойлівы да шэрай гнілі, мучністай расы. Ягады ярка-чырвоныя, бліскучыя, авальна-яйкападобнай формы, сплюснутыя з двух бакоў. Мякаць ружова-чырвоная, сакавітая, кісла-салодкая.

ГАТУНКІ ПОЗНЯГА ТЭРМІНУ ВЫСПЯВАННЯ

Зенга-Зенга. Гатунак раянаваны па ўсёй рэспубліцы. У сырыя гады пашкоджваецца шэрай гніллю. Ягады сярэдняй велічыні, цёмна-чырвоныя, кісла-салодкія.

ГАТУНКІ НЕРАЯНАВАНЫЯ, АЛЕ ДОБРА ЗАРЭКАМЕНДАВАЛІ СЯБЕ Ў БЕЛАРУСІ

Дачніца. Гатунак беларускай селекцыі, сярэдняга тэрміну выспявання, зімастойкі, высокаўраджайны. Ягады чырвоныя, бліскучыя, плоскакруглыя, са злёгку выражанай шыйкай, салодкія, з прыемным спецыфічным смакам.

Віцязь. Гатунак расійскай селекцыі, сярэдняга тэрміну выспявання, зімастойкі. Ягады сярэдняй велічыні (9 г), чырвоныя.

Папялушка. Гатунак расійскай селекцыі, сярэдняпозняга тэрміну выспявання, зімастойкі, скараплодны, устойлівы да мучністай расы. Ягады буйныя (40 г першага збору, 23 — масавага). Мякаць ярка-чырвоная, кісла-салодкая.

Рэд Гантлет. Гатунак выведзены ў Шатландыі, сярэдняпозняга тэрміну выспявання, зімастойкі, устойлівы да мучністай расы. Ягады сплюснутыя з бакоў, ярка-чырвоныя, транспартабельныя.

Феерверк. Гатунак расійскай селекцыі, сярэдняга тэрміну выспявання, адносна зімастойкі, высокаўстойлівы да мучністай расы. Ягады буйныя да 35 г (першы збор), цёмна-чырвоныя, сакавітыя, кісла-салодкія.

Тэніра. Гатунак галандскай селекцыі, позняга тэрміну выспявання, зімастойкі, устойлівы да хвароб, высокаўраджайны. Ягады канічнай формы, сярэдняй велічыні, чырвоныя, кісла-салодкія, маюць добрую транспартабельнасць.

ВАШ КВЕТНІК

Шматаблічная настурка

Цяжка ўявіць сабе сад без цудоўнай дэкаратыўнай настуркі (капуцынскі крэс, індзейскі крэс, цвятная салата). Зялёныя лісцікі, ярка аранжавыя, чырвоныя, вішнёвыя ці жоўтыя кветкі наўрад ці пакінуць кагосьці абыякавымі. А калі да гэтага дадаць працяглае цвіценне, нескладанасць ў вырошчванні і доглядзе, непатрабавальнасць да глебы — пытанне, відаць, не стаіць — быць настурцы ў нашых садах.

Сярод больш чым 90 розных відаў настуркі ёсць аднагадовая расліна і шматгадовая, расліна, якая расце вертыкальна на апорах, сцелецца па зямлі, ёсць ампельныя віды.

Настурка не вельмі патрабавальная да ўрадлівасці глебы, толькі зусім не выносіць як пераўвільгатнення, так і перасыхання. Садзіць яе можна расадай, а можна высяваць непасрэдна ў грунт. На пастаяннае месца расаду высаджваюць, калі мінуе пагроза замаразкаў, у канцы мая—пачатку чэрвеня. Расліна дрэнна пераносіць перасадку, таму трэба старацца не пашкодзіць каранёвую сістэму. Сеяць настурку ў грунт пажадана на сонечнае месца, захаванае ад халоднага ветру. Пастарайцеся моцна не заглыбляць насенне ў глебу, бо слабым парасткам цяжка прабіцца праз тоўсты слой зямлі. У чэрвені для стымуляцыі росту расліну можна падкарміць комплекснымі ўгнаеннямі з пераважаннем у іх азоту. Але не перастарайцеся — на ўгноенай глебе настурка моцна разрасцецца на шкоду цвіценню, якое настае праз 40—50 дзён пасля з'яўлення ўсходаў. Якімі будуць кветкі, гэта залежыць ад выбранага вамі гатунку.

З надыходам восені ў настуркі выспявае насенне, падобнае на буйную гарошыну. Спеласць насення вызначаецца вельмі проста. Калі пры дакрананні гэтыя гарошынкі лёгка аддзяляюцца адна ад другой, значыць настаў час збору ўраджаю. Насенне настуркі захоўвае ўсходжасць 3—5 гадоў. Лепш за ўсё насенне захоўваецца ў палатняных мяшочках пры пакаёвай тэмпературы. У гэтым выпадку вы будзеце ўпэўнены, што і на наступны год гэта расліна ўпрыгожыць ваш сад і агарод.

Менавіта агарод. Так, пасеяўшы настурку на агародзе, можна засцерагчы агародніну ад многіх шкоднікаў. Яе пах не падабаецца грызунам, тлі, каларадскаму жуку, белакрылцы і вусеням капусніц. Шчыра кажучы, пры дапамозе настуркі вы ад шкоднікаў поўнасцю не пазбавіцеся, але колькасць іх, вядома, зменшыцца. Высаджваюць настурку, каб засцерагчы ад нематод, а таксама ад вірусных і грыбковых захворванняў агародніны, фітафтарозу бульбы. Цікава, што суседства настуркі на адной градцы, напрыклад, з радыскай, надае ёй больш востры, гарчычны смак. Гэта расліна цудоўна ўжываецца з бульбай, фасоляй, бабамі, капустай, гарохам, рэдзькай. А вось разам з пятрушкай яе лепш не садзіць.

У народнай медыцыне выкарыстоўваюць ад мноства хвароб. Прымяняюць настурку і касметалогіі, настойка з яе лісцяў дапамагае справіцца з некаторымі захворваннямі скуры, прышчамі і фурункуламі, а таксама ўмацоўвае валасы і надае ім страчаны бляск.

Прысутнасць настуркі на кухні таксама цалкам апраўдана, бо яна не толькі прыгожая, карысная, але яшчэ і смачная. Яе любяць дабаўляць у салаты, выкарыстоўваюць пры прыгатаванні воцатаў і розных прыпраў. Вы ніколі не каштавалі — вам абавязкова спадабаецца! А дапамогуць у гэтым нескладаныя рэцэпты:

Вострая прыправа з настуркі і чырвоных парэчак

Лісце і кветкі парэзаць як мага драбней, добра перамяшаць з пюрэ з ягад чырвоных парэчак, дадаць прапушчаны праз часночніцу часнок і алей (на смак). Настурка, парэчкі і часнок бяруцца ў роўных частках. Захоўваюць такую прыправу ў халодным месцы.

Настурка марынаваная (каперсы)

Вельмі часта ў кулінарных кнігах можна сустрэць словы: «Дадайце каперсы». Не ўсе ведаюць, што гэта такое. Каперсы — марынаваныя бутоны і плады каперсавых раслін, якія растуць на поўдні. Пры дабаўленні іх у ежу страва набывае кіславата-востры смак. У нас жа лепшым заменнікам каперсаў можа стаць марынаваная настурка, якая гатуецца вельмі проста. Для марынавання збіраюць толькі няспелае насенне і бутоны. Іх трэба вымыць, абсушыць, раскласці ў пастэрылізаваныя слоікі, заліць гарачым марынадам (гатуецца гэтак жа, як для агуркоў) і шчыльна закрыць. Захоўваць у халодным месцы, выкарыстоўваць як прыправу да мясных і рыбных страў, дадаваць у салянкі і супы.

Салата з настурцыі

Маладое лісце добра прамыць, дробна нарэзаць, дадаць зяленіва, лімонны сок, пасаліць. Можна запраўіць смятанай ці ягадным воцатам. І ешце на здароўе.

Кветкі і астралогія

Блізняты — лёгкі, паветраны знак Задыяка, знак прыязельскіх адносінаў і абмену інфармацыяй. Расліны Блізнят — гэта розныя аспарагусы, папаратнікі, плюшчы, традэсканцыі, хларафітум чубаты, пёрыстыя і фінікавыя пальмы.

Калі вы адчуваеце сябе адзінокімі і няма з кім пагаварыць, калі вы пакутуеце ад сарамлівасці і не можаце знайсці ў адпаведны момант патрэбных слоў, развядзіце ў сябе расліны Блізнят. Дзякуючы сваёй энергіі, яны дапамогуць вам стаць больш гаваркім, дапамогуць знайсці камунікабельных людзей.

Блізняты — гэта яшчэ і знак маладосці. Таму іх расліны сваёй прысутнасцю будуць падтрымліваць у вас лёгкасць і рухомасць, дапамогуць заставацца заўсёды маладымі душой і целам.

Расліны Блізнят дапамагаюць у вучобе, таму іх добра мець у навучальных установах як памочнікаў паспяховай вучобы і хуткага засваення ведаў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.693. Індэкс 63850. Зак. № 2778. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12